Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztową uiszczono ryczałtem.

СЛОВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12 m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Субота 20-га кастрычніка 1928 г.

Зьезд адложаны.

У панядзелак 15-га кастрычніка беларускае грамадзянсcва м. Вільні было зьдзіўлена надзвычайнай весткай, што Зьезд Т-ва Беларускай Школы, які быў прызначаны на 21 кастрычніка, адложаны. У паведамленьні, якое выслала Камісія па скліканьню Зьезду, як прычына адкладу, выстаўляецца той факт, што на мясцох нібы да таго часу ня былі „яшчэ праведзены выбары дэлегатаў" — і што „некаторыя Гурткі і Акружныя Управы адвольна (самахоць, без павятовых Зьездаў) вызначаюць дэлегатаў на маючы быць Агульны Сход", і падаецца тлумачэньне з Статуту Т-ва, што

1) „Акружныя Управы на сваіх паседжаньнях вызначаюць на Агульны Сход па 2 дэлегаты.

2) „Акружныя Управы склікаюць Зьезд дэлегатаў ад Управаў Гурткоў свайго вокругу, на якім таксама выбіраюцца па 2 дэлегаты ад Гурткоў вокругу" і што

3) „Тыя Гурткі, што ня маюць Акружных Управаў, далучаюцца да суседніх Управаў".

Між тым нам дакладна было вядома, што амаль усе Управы зрабілі папярэднія зьезды і выбралі дэлегатаў, згодна статуту і не адзін Гурток сам „адвольна" не пасылаў дэлегатаў (каб паслаў, то гэты дэлегат быў-бы, ясна, прызнаны толькі з дарадчым, а не рашаючым голасам).

Пры той напружанай атмасфэры, якая ўтварылася навакол Т-ва Бел. Шк. ў беларускім грамадзянстве, такое паведамленьне і тлумачэньне Камісіі, якая зрабіла ўсё без паразуменьня з грамадзянствам — выдае больш як дзіўным і ставіць самую камісію проста ў нявыразнае палажэньне адносна масаў, згуртаваных у Т-ве. Усе ведаюць, што Зьезд вызначаўся, як неабходнасьць, па трэбаваньню аддзелу бясьпечнасьці ў Вільні, усе ведаюць, што ад Зьезду залежыць самае існаваньне ўсяго Т-ва, усе чакалі Зьезду, каб выйсьці нарэшце з таго невядомага палажэньня, у якім апынулася Т-ва ў зьвязку з вядомымі „завешаньнямі" і „адвешаньнямі". Да таго-ж масы былі ўстрывожаны тымі ўпорнымі чуткамі, якія йшлі з Вільні, аб адыходзе ад лініі папярэдняе працы некаторых дзеячоў. І вось пры такім напружаным палажэньні робіцца адклад Зьезду!

Мы ня думаем асуджваць Камісіі ў выяўленьні ею злой волі. Аднак, мы ня можам пакінуць усе масы, згуртаваныя ў Т-ве Беларускае Школы ў палажэньні нічога няведаньня. Мала таго, пры той скамплікаванай сітуацыі, у якой знаходзіцца Т-ва, робіцца ясным для ўсіх, што адказнасьць за далейшы лёс Т-ва бярэ на сябе Камісія і тыя дзеячы, з якімі Камісія, бязумоўна, была ў паразуменьні, што да адкладу Зьезду.

Тым ня меней, жадаючы захаваньня Т-ва, мы заклікаем усе органы Т-ва і ўсе працоўныя масы, уваходзячыя ў яго, захаваць поўны спакой і выдзержку і зрабіць усе фармальнасьці, вымаганыя статутам (калі гэта яшчэ ня зроблена) і паданыя ў паведамленьні Камісіі, якое ніжэй зьмяшчаем.

Ня можам усё-ж прайсьці без засьцеражэньняў каля тых слоў паведамленьня, што „тэрмін Сходу будзе вызначаны па атрыманьні ад Акружных Управаў копіяў пратаколаў, як сходаў дэлегатаў Гурткоў таго ці іншага вокругу, так і копіі пратаколаў паседжаньняў Акружных Управаў, завераных, як першыя, так і другія, Акружнымі Управамі". Гэты пункт статутам Т-ва не вымагаецца, а можа прынясьці такія шкоды, выніку якіх трэба высьцерагацца ўсімі сіламі. Мы проста зьдзіўлены такою пастаноўкаю справы і мімаволі спыняемся—нашто і каму гэта патрэбна? Зразумела, што лічым неабходным давясьці аб гэтым да ведама масаў. Паскольні гэта не вымагаецца ані статутам, ані якімі законамі, мы прапануем не пасылаць ніякіх пратаколаў, а абмежыцца *простым паведамленьнем* Акружных Управаў, што *раённыя зьезды адбыліся і што пратаколы зьездаў і сьпісак выбраных дэлегатаў будзе прывезены старшынямі дэлегацыяў у дзень Зьезду*. Але гэтыя пратаколы павінны быць у Управах і павінны быць захаваны ўсе іншыя вымаганьні паведамленьня, бо, пэўна-ж, пры не выпаўненьні іх выбраныя дэлегаты рызыкуюць быць без рашаючага голасу. Калі ўжо такія пратаколы пасланы—бяды гэта вялікае ня робіць, але, хто яшчэ не паслаў, мусяць зрабіць простае паведамленьне.

Разам з тым трэба, каб Зьезд быў масавым. Кожны Гурток Т-ва мае магчымасьць паслаць свайго дэлегата, які можа мець дарадчы голас на Зьезьдзе. Справа Т-ва Беларускае Школы ўсё-ж вельмі дарагая для беларускіх працоўных гушчаў і трэба ўсім прыняць учасьце ў вырашэньні лёсу свае культурна-асьветнае інстытуцыі. Мы павінны захаваць яе і за захаваньне вясьці змаганьне.

У данны мамэнт *патрэбны толькі спакой і выдзержка*!

Акружным Управам, Гурткам і Сябрам Таварыства Беларускае Школы.

Гэтым Дачасная Паўнамоцная Камісія Т-ва Беларускае Школы паведамляе, што Агульны Сход Т-ва, які быў вызначаны на дзень 21-га кастрычніка г. г., адкладаецца дзеля таго, што да гэтага часу яшчэ не праведзены выбары дэлегатаў. Некатарыя Гурткі і Акружныя Управы адвольна вызначаюць дэлегатаў на маючы быць Агульны Сход Т-ва Беларускае Школы, чым нарушаюць парадак арганізацыі Агульнага Сходу, прадбачанага арт. 7, § 31 статуту. Каб Агульны Сход адбыўся і лічыўся правамоцным, трэба абавязкава паступаць, згодна вышэй азначанага артыкулу статуту, а іменна:

I) Акружныя Управы на сваіх паседжаньнях вызначаюць на Агульны Сход па 2 дэлегаты.

II) Акружныя Управы склікаюць зьезд дэлегатаў ад Управаў Гурткоў свайго вокругу, на якім таксама выбіраюцца па 2 дэлегаты ад Гурткоў вокругу.

III) Тыя Гурткі, што ня маюць Акружных Управаў, далучаюцца да суседніх вокругаў і сумесна выбіраюць па 2 дэлегаты, як ад аднаго вокругу.

1. Гурткі Пружанскага павету далучаюцца да Косаўскае Акружнае Управы; 2. Гурткі Пастаўскага і Браслаўскага паветаў — да Глыбоцкае Акружнае Управы (Дзісьненскі павет); 3. Гурткі Валожынскага і Нясьвіскага паветаў — да Мірскае Акружнае Управы (Стаўпецкі павет); 4. Гурткі Сакольскага павету — да Горадзенскае Акружнае Управы; 5. Гурткі Пінскага павету — да Баранавіцкае Акружнае Управы і 6. Гурткі Маладэчанскага павету — да Вялейскае Акружнае Управы.

УВАГА: 1. Дачасная Паўнамоцная Камісія Т-ва адначасна паведамляе адпаведныя Стараствы аб далучэньні Гурткоў памянутых паветаў да адпаведных Акружных Управаў.

УВАГА: 2. Паведамленьне Гурткам аб сходзе, якія ня маюць сваіх Акружных Управаў, будуць высланы тымі Акружнымі Управамі, да якіх гэтыя Гурткі далучаны.

УВАГА: 3. Сьпіскі Гурткоў і іх адрасы адначасна высылаюцца ў адпаведныя Акружныя Управы.

IV) У тых вокругах, дзе ўжо адбыліся агульныя сходы дзеля выбару дэлегатаў, гэтыя дэлегаты могуць уважацца паўнамоцнымі.

V) Дачасная Паўнамоцная Камісія прапануе Акружным Управам як найхутчэй прыступіць да арганізацыі агульных сходаў дзеля выбару дэлегатаў, зазначаючы, што тэрмін сходу будзе вызначаны па атрыманьні ад Акружных Управаў копіяў пратаколаў, як сходаў дэлегатаў Гурткоў таго ці іншага вокругу, так і копіі пратаколаў паседжаньняў Акружных Управаў, завераных, як першыя, так і другія Акружнымі Управамі.

VI) Мандаты дэлегатам, як ад Акружных Управаў, так і ад Гурткоў выдае Акружная Управа.

VII) Дачасная Паўнамоцная Камісія настойна дамагаецца ад Акружных Управаў і Управаў Гурткоў прыняць энэргічныя меры да сбору сяброўскіх складак, а ўсіх сяброў Таварыства заклікае аа выкананьня сваіх абавязкаў узносу сяброўскіх складак, бо брак срэдстваў затрудняе скліканьне Зьезду.

Дачасная Паўнамоцная Камісія:
(—) А. Трэпка
(—) К. Крук
(—) Я. Шнаркевіч.

Новы скандал з „англа-французскім марскім кампрамісам"...

Французскі ўрад далей кампрамітуецца, асабліва ў вачох Амэрыкі,—сваім паступаньнем у справе апублікаваньня ў амэрыканскай прэсе тэксту сэкрэтнага „англа-французскага кампрамісу", дый яшчэ з уласным лістам мін. Брыяна. Сьледства французскіх уладаў неяк выкрыла, што сэкрэтны дакумант гэты „здабыў" у Парыжу—у самым міністэрстве загран. спраў—з-пад носу самога Брыяна—спрытны карэспандэнт багацейшай амэрыканскай прэсавай „агенцыі" Хірста, п. Хоран—пэўне-ж за ўсемагутныя, раскрываючыя ўсе дзьверы, сэрцы і сэкрэты даляры!.. У Амэрыцы такая „штука" газэтнага рэпартэра лічыцца яго прафэсіянальным трыумфам... Але пазбаўленае гукам усяго скандалу раўнавагі міністэрства Брыяна не знайшло нічога лепшага, як „затрымаць" паліцыяй карэспандэнта, запрасіць яго... у габінэт высокага ўрадоўца міністэрства, які — пад пагрозай высяленьня—запрапанаваў яму... выдаць французскім уладам таго ўрадоўца, ад якога ён здабыў сэнсацыйны дакумант... Зразумела, амэрыканскі журналіст — кіраваны англа-саксонскім гонарам „добрай ігры" і прафэсіянальнай „этыкай", наадрэз адмовіўся ад паліцэйскай прапазыкі шляхотных французскіх дыплёматаў... Тады яго змусілі тутжа падпісаць абавязацельства аб тым, што ён пакіне граніцы Францыі... А тым часам—у амэрыканскай, нямецкай і англійскай прэсе закіпела... Урэшце, як можна было спадзявацца, у справу ўмяшаўся сам урад магутнай Амэрыкі — у абароне свайго грамадз.

Дэпартамэнт загран. спраў Амэр. Штатаў зьвярнуўся да французскага ўраду, каб той—„добра разглядзеў справу арыштаваньня і высылкі прадстаўніка концэрну амэрыканскіх газэтаў і каб аб рэзультатах сьледства дакладна паведаміў амэрыканскі ўрад"... У канцы ноты—яшчэ больш забіўчая дапіска: „ад справаздачы французскага ўраду амэрыканскі ўрад узалежняе характар далейшых сваіх крокаў у гэтай справе"...

Справу таварыша пэўне-ж не пакінулі саюзы журналістаў у Парыжу. Саюз амэрыканскіх і англійскіх журналістаў зьвярнуўся да Пуанкарэ і Брыяна, каб яны загадалі новае сьледзтва ў справе...

Адазваўся ўрэшце з забіўчай для Францыі адозвай і сам „прэсавы кароль" Хірст. Ён выразіў „зьдзіўленьне"—чаму гэта Францыя так уз'елася на апублікаваньне „англа-французскага марскога трактату". — „Амэрыканскі і без таго дасканала ведае, што Францыя (французскі ўрад?) заўсёды рада зрабіць усё для яе магчымае, каб толькі пашкодзіць пасьпехам Амэрык. Штатаў"...

„Апублікаваньне ўказанага дакументу прычынілася толькі да спыненьня ў амэрыканскім грамадзянстве ўсялякіх існаваўшых сумліваў"...

Урэшце прамовіла і франц. міністэрства загран. спраў. Брыян заяўляе, што амэрык. карэспандэнт вінаваціцца ня ў тым, што ён „здабыў" сэнсацыйны дакумант з канцэлярыі міністэрства (гэта, пэўне-ж—віна падкупнага ўрадоўца!), але—у тым, што ён—без дазволу французскага ўраду апублікаваў дакумант, „праўным уласьнікам якога зьяўляецца французскі ўрад"... Дык пастанова ўраду—аб выдаленьні карэспандэнта з Францыі, гэта—кара за тое, што ён „парушыў існуючыя формы міжнародных звычаяў"...

Апошняя вестка ў гэтай справе кажа што — на зборны ліст англа-амэрыканскіх журналістаў—Пуанкарэ адказаў, што ён ня ўмешваецца ў справы мін. загранічн. спраў, а Брыян адказаў, што згаджаецца дазволіць высыланаму карэспандэнту адлажыць ад'езд з Францыі, пакуль ня будзе цалком высьветлена справа і прынята канчальнае рашэньне франц. ураду.

У французскіх газэтах зьявілася яшчэ паў-афіцыяльнае высьвятленьне справы амэрыканскага журналіста, здабыўшага сэкрэтны дакумант у справе англа-французскага паразуменьня.

Камунікат гэты—выражае зьдзіўленьне з прычыны абурэньня ўсей прэсы проці рэпрэсіяў проці амэрыканскага карэспандэнта.

Трэба было-б, наадварот, кажа камунікат, дзівіцца лагоднасьці кары—высылкі, замест аддачы пад суд—за трыманьне ў сябе і апублікаваньне дакумэнта, датычучага справы бясьпечнасьці дзяржавы і нацыянальнай абароны, за што па закону трэба пасадзіць у вастрог. Карэспандэнт Горан, дзеля таго, ня можа мець прэтэнзіяў да французскага ўраду. Вельмі сумліўна дзеля таго, каб умяшацельства саюзу англа-амэрыканскіх журналістаў было прыхільна спаткана французскім урадам. Французская прэса ў апошнія дні раскрыла амаль што ўсю тайну здабыцьця амэр. журналістам Хоранам сэкрэтнага дакуманту англа-французскай марской умовы. Высьветлілася, што Хоран знайшоў ход да аднаго з „маладых французскіх дыплёматаў", праз якога атрымаў на некалькі мінют дакумант. Гэта каштавала Хорану быццам 10,000 даляраў, якія былі падзелены паміж 4 асобаў. Усе яны цалком названы ў прэсе. Усё гэта быццам сцьверджана сьледзтвам. Быццам Хоран „даў слова ганору", што не апублікуе дакумэнту, але толькі азнаёміцца з ім—дзеля сьцісласьці артыкулу, які меў напісаць да сваіх газэтаў.

Сам Хоран ужо выехаў з Парыжу ў Лёндан, дзе заявіў, што весткі французскай прэсы—праўдзівыя...

Апошняя тэлеграма афіцыяльн. французскага агенцтва дае ўжо зусім новае асьвятленьне скандальнай справе, няўдала раздутай, на сваю-ж галаву, Брыянам. Яна кажа, што ня трэба прыдаваць залішняга значэньня апублікаваньню ўсіх гэтых дакумэнтаў. Гэта былі 1, звычайны інфармацыйны акульнік для ўсіх французскіх дыплёматычных пляцовак за граніцай у справе працы камісіі, падрыхтоўваючай разбраенчую канфэрэнцыю і 2, скарочаная справаздача ходу перагавораў паміж Францыяй і Англіяй — у справе... стасункаў прэсавых установаў мін. загран. спраў да журналістаў (?!). Ужо ад 2 жніўня прэсавы аддзел міністэрства меў у сябе гэтыя дакумэнты, дык „малады дыплёмат" з гэтага аддзелу знаў іх зьмест, якім і падзяліўся з амэр. журналістам, якому хацеў „інсьпіраваць" точна інфармаваныя артыкулы...

Дык, кажа тэлеграфны афіцыёз франц. ураду,—адно, што можна закінуць дыплёмату, гэта—„недахоп ар'ентацыі" і—„залішнюю ветлівасьць і... уступлівасьць" у стасунку да амэр. журналіста...

Чым выкліканы такі раптоўны паварот усей справы—ад залішняй трагэдыі да яўнай ужо фарсы, цяжка зразумець, ня ведаючы ўсіх закулісных махінацыяў.

У кожным разе скандал ад гэтага павароту ня зьменшыўся...

З работніцкай забастоўкі у Лодзі.

Вялізарная работніцкая забастоўка ў Лодзі трывае далей, што дня пашыраючыся і прыймаючы грозьнейшыя разьмеры.

Аб прабегу забастоўкі мы падалі кароценькія весткі, узятыя з буржуазнай польскай прэсы. Кароткія інфармацыі прыходзіцца надаваць дзеля таго, што больш шырэйшыя могуць наражаць газэту на канфіскату, у выніку чаго, нашы чытачы ня будуць мець магчымасьці пачуць і таго, чаго навет і буржуазная прэса ня можа затаіць.

Па-поўдні 12 г. м. адбылася ў Лодзі канфэрэнцыя прадстаўнікоў 20 прафсаюзаў усіх галінаў прамыслу, гандлю і ўстановаў публічнага ўжытку. Пастаноўлена ад панядзелка (15 г. м.) прыступіць да агульнай забастоўкі ў Лодзі і цэлай лодзкай акрузе, галоўнае ў установах публічнага ўжытку.

Апрача гэтага, прынята прапазіцыя, у разе прадаўжэньня агульнай забастоўкі ў Лодзі, зьвярнуцца да цэнтральных уладаў прафсаюзаў з жаданьнем аб'яўленьня агульнай забастоўкі ў-ва ўсей Польшчы.

„У той-жа самы дзень, згодна з дакляраваньнем работнікаў, адбыўся цэлы рад работніцкіх вечаў, на якіх прамаўлялі часткай тутэйшыя, часткай прыехаўшыя з Варшавы дзеячы клясавых арганізацыяў.

У некалькіх мяйсцох дайшло да бурлівых інцыдэнтаў, выкліканых аднолькава пішуць, як камуністамі, а таксама і праціўнікамі забастоўкі.

Камуністы праявілі жывую дзейнасьць. Камуністычны пасол Росяк „прабаваў“ выклікаць у некаторых мяйсцох горада дэманстрацыі, між іншым, і перад вастрогам, дзе сядзяць палітычн. вязьні. Аднак, паліцыя перашкодзіла дэманстрацыі“. („Głos Prawdy“ № 284).

13 г. м. кіраўніцтва ўсіх прафсаюзаў здавалі на работніцкіх сабраньнях справаздачу з сваей учарашняй канфэрэнцыі. Усе прафсаюзы прынялі пастанову приступленьня да агульнай забастоўкі.

Выбрана забастовачная камісія дзеля агульнай забастоўкі, працуючая сумесна з забастовачнай камісіяй валакнянікаў.

У ваяводзтве-ж адбывалася нарада прадстаўнікоў улады ў сувязі з прыгатаваньнем работнікаў да агульнай забастоўкі.

У той-жа дзень пастанавілі далучыцца да агульнай забастоўкі канцэлярысты. Дворнікі абвясьцілі на наступны дзень агульнае сабраньне, з мэтай пастановы поўнага (całkowitego) далучэньня да забастоўкі. На тэлефанічнай станцыі адбылося агульнае сабраньне тэлефаністак, якія пастанавілі прыступіць да забастоўкі таксама.

Да агульнай забастоўкі вынясьлі пастанову далучыцца і адміністрацыйныя працаўнікі Касы Хворых. З Касы Хворых будуць працаваць толькі шпіталі ды пагатоў'е.

Акружны інспэктар працы, Войткевіч, паведаміў тэлефанічна міністра працы аб абвяшчэньні агульнай забастоўкі.

Прыехалі ў Лодзь камуністычныя пасолы Сыпула і Варскі. Намерваюцца ў наступны дзень с'арганізаваць некалькі работніцкіх вечаў.

14 г. м., проці спадзяваньняў, усе магістрацкія працаўнікі пастанавілі прыступіць да забастоўкі. Магістрат пастанавіў выдаваць бастуючым і іх сем'ям бясплатныя абеды.

Цэнтральная камісія зьвярнулася да ўсіх прафсаюзаў з заклікам распачаць збор ахвяраў на карысьць бастуючых. Шаўцы і дворнікі пастанавілі прыступіць да агульнай забастоўкі. Спадзяючыся забастоўкі тэлефаністаў,—на тэлефанічных станцыях адкамандыравана тэхнічная частка войска, маючая абслужваць іх зараз па выхадзе стуль тэлефаністаў. Гэтая ведамасьць мілітарызацыі тэлефонаў выклікала сярод бастуючых вялікае парушэньне. Работніцкія саюзы прынялі проці гэтага адпаведныя меры.

Уплыў камуністаў на ход забастоўкі ўзрастае. Яны змабілізавалі ўсе свае сілы, павызначалі цэлы рад мітынгаў.

15 кастрычніка работнікі распачалі агульную забастоўку. Сталі абсалютна ўсе прадпрыемствы, а навет і ўстановы публічнага ўжытку—як газоўня, электроўня, каналізацыя, Каса Хворых і інш.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Першыя сутычкі ў Лодзі.

Ня гледзячы на абвяшчэньне агульнай забастоўкі ў некатарых установах—вадаправодных і каналізацыйных—некаторыя работнікі яшчэ працавалі. Паміж працуючымі і забаставачнай камісіяй дайшло да вострай бойкі, хоць у абароне страйкаломаў і стаяла паліцыя.

Трамваі таксама стаяць.

Забастоўка пашыраецца.

Забастоўка з каждай мінютай пашыраецца і мацнее. Забаставала прыслуга рэстаўрацыяў (гасьцініцаў), абслуга кінаў, тэатраў, бастуюць шофэры, друкарні і інш.

Прафсаюзы пастанавілі цьвёрда стаяць пры сваіх жаданьнях і прадоўжыць агульную забастоўку аж да поўнай перамогі.

В е ч ы.

У розных мейсцах гораду адбываюцца вечы, на якіх сябры забастовачных камісіяў паведамляюць работнікаў аб прабегу забастоўкі.

У Згержы навет дайшло да „ekscesów“ (непарадкаў), у сувязі з выступленьнем камуністычнага пасла Росяка, які зрабіў веча перад магістратам. Сабралася больш 1000 работнікаў. Паліцыя іх разагнала. Росяк з'арганізаваў другое веча — на Рынку Кілінскага, але і яно было разагнана паліцыяй. У канцы пасол Росяк сеў у трамвай, з намераньнем ехаць у Лодзь, але, як кругом трамваю сабраўся работніцкі натаўп, дык Росяк ізноў пачаў прамаўляць да работнікаў. Паліцыя і тут „інтэрвэн'явала“ і арыштавала 5 чалавек. Даведаўшыся аб працы ў згерскай электроўні, бастуючыя скіраваліся туды, каб змусіць працуючых яшчэ работнікаў да забастоўкі,—але гэтаму перашкодзіла паліцыя.

Такім спосабам агульная забастоўка абхапіла ўсе галіны працы. Грознасьць сітуацыі дапаўняе брак вады, асьвятленьня, камунікацыі і г. д. і „ажыўленая дзеяльнасьць „вывротовых“ элемэнтаў, якія ўвіхаюцца сярод сабраных на вуліцах работнікаў“ („Rzplita“ № 297).

Забастоўка ў іншых гарадох.

У Тамашове, Згержы, Пабіянскай Рудзі, Здунскай Волі забаставалі ўсе фабрыкі, апрача публічнага ўжытку.

Дзеля падмогі лодзкай забастоўцы забаставаў увесь петракоўскі магістрат—разам з бурмістрам.

Сьвята Непадлегласьці.

Польская прэса паведамляе аб прыгатаваньнях па ўсей Польшчы да сьвяткаваньня 10-ўгодкаў непадлегласьці Польшчы.

Варшаўская прэса інфармуе, што ў Варшаву на гэтае сьвята 11. XI. г. г. — маецца прыехаць больш 100 тысяч „strzelców“, і, апрача іх, розныя вайсковыя і ідэёва падобныя ім арганізацыі.

Як жа адчуюць працоўныя масы Польшчы гэтае сьвята 10-годзьдзя „непадлегласьці“?

Справа з новымі пасольствамі.

У сваім часе польская прэса падавала аб намераньнях польскага ўраду ўтварэньня новых пасольстваў у Кітаі — ў Пэкіне і ў Італіі—ў Лізбоне. Цяпер-жа польская прэса піша, што „плянаванае адчыненьне гэтых пасольстваў адсоўваецца на далейшы плян, бо новы бюджэтны прэлімінаж ня мае на гэта крэдытаў“.

Бурлівы пачатак.

Згодня з інфармацыямі прэсы, акадэміцкі школьны год ў Кракаве пачаўся досыць бурліва: гвалтоўнаю бойкаю паміж нацыяналістычнай і „дэмакратычнай“ моладзьдзю.

Суд над камсамольцамі.

У Варшаве закончыўся суд у галоснай справе так званых „польскіх камсамольцаў“.

Засуджаны: 4 на 4 гады цяжк. вастрогу; 4 на 2 гады цяжк. вастрогу; 2 на год цяжк. вастрогу і адзін камсамолец на год крэпасьці.

Яшчэ суд над камуністамі.

Акружны суд у Сасноўцы прыгаварыў на 3 гады цяжк. вастрогу Міхася Цішэўскага, былага кандыдата камуністычнага сьпіску і Уладыслава Драбіка на 6 месяцаў крэпасьці. Засуджаны яны за прыналежнасьць да кампартыі і за „вывротовую“ агітацыю.

Дэлегацыя дзярж. ўрадоўцаў.

Надовячы ў прэм'ера Бартэля была дэлегацыя дзяржаўных ўрадоўцаў, прадставіўшая яму цэлы рад пастулатаў (трэбаваньні), як у галіне пэнсіі, авансаў, стабілізацыі і г. д.

Прэм'ер на гэта адказаў, што ў цяперашніх варуках яшчэ не магчыма ўрэгуляваць платы ўрадоўцаў, і што яны будуць ўрэгляваны ўрадам пры першай магчымасьці.

Кангрэс вугляконаў.

У Кракаве пачаўся IV кангрэс прафсаюзу вугляконаў і гарнякоў Польшчы. Канфэрэнцыя нараджваецца над сітуацыяй у польскім гарняцтве.

Цікавае зьявішча.

Апошнімі днямі ў Варшаве здарылася цікавае зьявішча—студэнты раскідалі паркан і рыштаваньне новабудаванага ангельскага магазыну, разьбілі некалькі аўтаматаў з заграмічнымі шакаладам і ў розных мейсцах горада „выдрукавалі“ на тратуарах і на мурох раскіданага рыштаваньня заклікі купляць свае тавары і ці ў Польшчы бракуе сваіх фабрыкаў?

Такая праца студэнтаў тлумачыцца тым, што ў сувязі з узмоцненай шырокай агітацыяй на карысьць краёвага тавару, студэнты адбывалі што дзень веча, а гэта ўжо „перайшлі ад моваў“ „do czynów“ (дзела).

Заграніцай.

Заявы літоўскага пасла ў Бэрліне.

Літоўскі пасол у Бэрліне Сідзікаўскас заявіў газэтнаму карэспандэнту—на падставе „прысуду“ француских юрыстаў — Літва спадзяецца перагляду справы Віленшчыны на новай міжнародавай канфэрэнцыі — з учасьцем СССР і Нямеччыны. Літва мае зрабіць аб гэтым фармальную прапазіцыю дзяржавам, але—у больш суадказны мамэнт.

Апошняй сэсіяй Лігі пасол не здаволены: Ліга пастанавіла прыняць якіясь „іншыя меры“—у разе, калі літоўска-польскія перагаворы ізноў не прывядуць да паразуменьня; Ліга „сабатуе“ скаргі віленскіх літвіноў на польскі ўрад, а гэта толькі псуе далей атмасфэру перагавораў. Літва трэбуе ад палякаў—трактату аб ненападзеньні і дэмілітарызацыі Віленскага паса.

У канцы пасол заявіў, што літоўска-нямецкія перагаворы ідуць шпаркім ходам, гандлёвы трактат з Нямеччынай будзе надпісаны праз некалькі дзён. Новы трактат яшчэ больш запрыязьніць абодва краі — палітычна і гаспадарча, чаго Літва горача жадае.

Зьдзекі нямецкіх абшарнікаў над работнікамі-палякамі.

Нямецкая сацыялістычная прэса з абурэньнем прыводзіць факты нячуванага тэрору з боку прускіх абшарнікаў у стасунку да сельска-гаспадарчых работнікаў, пераважна палякаў. За драбнейшыя рэчы ідуць прычэпкі, пабіцьцё, штрафы. Бьюць — навет кабет — самі абшарнікі, ці іх эканомы. За скаргі ў работніцкія арганізацыі — выкідаюць з працы. Абразок знаёмы і беларускім работнікам.

Нямецкая прамысловасьць выкідае з працы масы работнікаў.

Мэталёвая прамысловасьць паўночна-заходняй Нямеччыны і тканінная — у заходніх і паўдзённых абшарах краю—выкідаюць з працы—з прычыны крызісу — вялізарныя масы работнікаў. У адной тканінвай прамысловасьці Вэстфаліі, Баварыі і Надрэніі ў канцы кастрычніка мае астацца бяз працы 200 тыс. работнікаў, а ў металёвай прамысловасьці Вэстфаліі і Надрэніі на 1 лістапада мае быць выкінена на брук аж 800 тыс. работнікаў. Побач з тым награжае Нямеччыне і хваля забастовак. У гэтых днях спадзяюцца выбуху забастоўкі ў вугальным абшары Рурэ. У абшары Вальдэнбургу, дзе забастоўка ўжо трывае некалькі дзён, работнікі наладзілі вялікую дэманстрацыю, у часе якой пачаліся быццам напады на крамы з жыўнасьцяй.

Нямецкі „Цэпэлін“ прыбыў ў Амэрыку.

Нямецкі паветраны карабель „Гр. Цэпэлін“ (якія лётаці над намі ў часе вайны) прыбыў у Амэрыку, адбыўшы падарожжу пры вельмі непамысных атмасфэрычных варунках. Нямецкая дый сусьветная прэса з вялікім хваляваньнем сачыла за гэтай падарожжай. Бо-ж думкай арганізатараў падарожжы, апроч агітацыйнай рэклямы для нямецкай тэхнікі ў Амэрыцы, зьяўляецца арганізацыя сталай камунікацыі паміж Эўропай і Амэрыкай на гэтых „Цэпэлінах“. Цэпэлін значна спазьніўся, бо-ж — дзеля праціўнага ветру ды бураў, павінен быў значна адхіліцца ад простай дарогі, скіраваўшыся на паўдзень у заходняй Афрыцы.

Але потым спроба ўдалася цалком. Амэрыканскія месты, над якімі лётаў Цэпэлін — Вашынгтон, Філядэльфія, Нью-Іорк і інш. — былі ахоплены маніфэстацыямі ў часьць Нямеччыны.

Англійскія работнікі рыхтуюцца да выбараў.

Агульныя парляментцкія выбары ў Англіі маюць адбыцца толькі на вясну прышлага году, але ўсе англійскія партыі даўно ўжо вядуць пляновыя падрыхтаваньні да выбарнай кампаніі. Англійскія партыі — іх усяго тры — лічаць сваіх сябраў мільёнамі, кожная з іх мае надзеі здабыць уладу. Дык ясна, што мамэнт барацьбы за гэтую ўладу— на прышлае 5-лецьце — павінен быць добра і згары падрыхтаваны так, каб партыя магла змабілізаваць у час бою ўсе свае сілы.

Цяпер ужо ясна, што бітва разыграецца паміж 2 партыямі: кансэрватыўнай, трымаючай цяпер уладу, і — работніцкай. Партыя лібэралаў — значна слабейшая і, хаця мае iсьці на выбары ўсё-ж самастойна, але згары прапануе работнікам паразуменьне і поўную координацыю сілаў на выбарах. Гэта дадае новых шансаў работнікам — перамагчы на выбарах. У апошнія дні адбыліся — пасьля звезду лібэралаў — кангрэсы дзьвюх другіх партыяў: кансэрватараў і работнікаў. Кансэрватары, выслухаўшы даклад прэм'ера і лідэра (павадыра) партыі Балдвіна аб дзеяльнасьці ўраду, спрачаліся пераважна аб тым, ці павялічваць ды пашыраць мыта на артыкулы масавага спажыцьця, ці не: гэта значыць—ці лавіць на выбарах пераважна багатых, ці паставіць больш шырокую „стаўку“ на масавага спажыўца. Ніякага пляну ані шырока і дэталічна апрацаванай праграмы выраджаючыяся кансэрватысты ня маюць на прышлыя выбары.

Зусім інакш працуе ды рыхтуецца да выбараў маладая работніцкая партыя. Перадусім сама партыя, якая яшчэ нядаўна была толькі аб'яднаньнем цэлага сьцягу паасобных палітычных групаў, цяпер усё больш робіцца запраўднай адзінай сацыялістычнай партыяй, як і дзеінш у Эўропе. Партыя апрацавала дакладную праграму, у якой адказвае на ўсе важныя патрэбы дзяржавы і насяленьня, выразна распачынаючы пляновы пераход сучаснага буржуазнага ладу ў сацыялістычны.

Як ведама, кангрэс у Бірмінгэме выключыў з партыі камуністаў, якія, трэба думаць, на новых выбарах будуць у першы раз выступаць самастойна.

Англійская вугальная прамысловасьці ўсьцяж нясе страты.

Страты англійскай вугальнай прамысловасьці за другі квартал бяг. году перавысілі 3 з паловай мільёны фунтаў (фунт—5 даляраў). Гэта дзеля таго, што англійскія прамыслоўцы значна—сабе і работнікам (на страту)—зьніжаюць ніжэй уласных коштаў цэны на вывожаны за-граніцу вугаль — для таго, каб таннасьцю тавару ўдваяваць страчаныя ў часе вайны і забастоўкі замежныя рынкі. Але гэты зварот страчаных рынкаў неяк усе не ўдаецца.

Аўстралійскія маракі падтрымліваюць бастуючых партовых работнікаў.

Работніцкі фронт проці наступу працадаўцаў у саюзе з буйна буржуазным урадам Аўстраліі ўсьцяж пашыраецца. Спадзяваўшаяся залішне лёгкай перамогі армія капіталу пачынае разумець, што зламаць апор арміі працы ў нашыя часы можна толькі сякім-такім кампрамісам, але не „вэрсальскім дыктатам“... Ужо здавалася, быццам забастоўка партовых работнікаў у Аўстраліі зламана: прафэсіяналы выкінены з працы, іх мейсцы заняты „ахвотнікамі“ — штрэйкбрэхерамі. Правакатары працавалі ўсьцяж, каб бомбавымі нападамі выклікаць рэпрэсіі проці „праступнага руху“. Але масавы рух ішоў сваім шляхам; да забастоўкі ўсьцяж далучаліся ўсё шырэйшыя колы працоўнай арміі, адказваючы такім чынам работніцкай салідарнасьці на такую ж салідарнасьць прамыслоўцаў і іх ураду. У апошнія дні—побач з новымі рэпрэсіямі, шэрагі забастоўшчыкаў пашырыліся маракамі. Маракі порту Вікторыя 2./X. пастанавілі далучыцца да забастоўкі — у знак пратэсту проці новага закону аб парадку найма на работу — і зьвярнуцца да маракоў усіх іншых партоў краю, каб зрабілі тое-ж...

Прызнаньне Кітаем незалежнасьці Манголіі.

На гэтых днях наступіла здарэньне, вельмі вялікай вагі.—Міравы трактат, падпісаны Кітаем з Манголіяй, спыніў доўга цягнуўшуюся вайну паміж абодвума краямі і афіцыяльна прызнаў незалежнасьць Манголіі, якая дагэтуль была складовай часткай кітайскай тэрыторыі.

Манголія даўно ўжо знаходзілася пад сільным „уплывам“ Расеі, проці чаго ў свой час страшэнна абуралася Англія, пагражаючы навет вайной Расеі. За апошні час „расейскія ўплывы“, як можна думаць, значна ўмацаваліся. Проці незалежнасьці Манголіі—побач з Англіяй — паўставала і Японія. Але, трэба думаць, што Японія з свайго боку можа здолее дабіцца такой-жа „незалежнасьці“ Манчжурыі — можа таксама ў паразуменьні з СССР. У кожным разе—незалежнасьць Манголіі трэба лічыць вельмі значным пасьпехам радавай дыплёматыі ў цэнтральнай Азіі — і паражэньнем англійскай. Манголія дае магчымасьць СССР бліжэй падсунуцца да абшараў англійскага панаваньня ў паўдзеннай Азіі, пагражаючы яму мілітарна з поўначы...

Чума ў Манголіі.

„Кур. Варш.“ даведаўся з Масквы аб тым, быццам у Манголіі зьявілася страшэнна сільная эпідэмія чумы. У акрузе Ургі (сталіца Манголіі) уміраe да 2 000 чалавек у дзень. Радавы ўрад асыгнаваў 400 тыс. рублёў і прымае ўсе магчымыя меры дзеля барацьбы з заразай, якая можа захапіць, ня толькі СССР, але і ўсю Эўропу, як гэта было ўжо ня раз у працягу гісторыі.

Амэрыканскія фашысты „схапілі і схавалі“ камуністычнага кандыдата ў прэзыдэнты.

Як паведамілі газэты, амэрыканскі Вышэйшы Трыбунал прызнаў камуністычнай партыі права—нароўні з іншымі—выставіць свайго кандыдата на прэзыдэнты Злучан. Штатаў Амэрыкі. Быў партыяй выбраны кандыдатам Вэніямін Гітлаў. Але ён раптам счэз незразумелым спосабам. Паліцыя распачала пашуківаньне. Сьледзтва быццам дае думаць, што ён схоплены амэрыканскімі фашыстамі—славўным „Ку-Клукс-Клянам“ і — добра, калі толькі схаваны, а не пахаваны.

З жыцьця Горадні.

— **Пэпэзсы ў ролі абаронцаў Паўлюкевічаўшчыны і „Спадаршчыны“.** 22-га верасьня с. г. адбылася канфэрэнцыя, якая складалася з дэлегатаў ад паасобных прафэсіянальных саюзаў, мэтай якой было—адкаўленьне Рады Клясавых Прафсаюзаў (ня трэба зьмешываць з Акружной Радай хадэцкіх прафсаюзаў, якая налічвае паўтара прафсаюза з некалькі дзесяткаў асоб, а заданьнем якой ёсьць адцягнуць работніцкія масы ад клясавай барацьбы з іх адвечным ворагам. Буржуазія, палохаючы вось гэтыя масы пеклам, рознымі мукамі ды іншымі няпрыемнасьцямі, якія быццам плябей г. з. пралетарый мог накаштаваць на тым сьвеце, калі ня будзе іх слухаць. Але ў XX век такімі аргумэнтамі вельмі цяжкая справа пераканаць работнікаў, бо яны кажуць, мы хочам на гэтым сьвеце жыць добра, паночкі хадэкі!—а на тым сьвеці, кажуць, хіба, што горш ня будзе ад зямнога пекла якое, ёсьць пры сучасным буржуазным гаспадарстве), дык вось дзеля чаго гэтая хадэцкая Рада налічвае такі малы лік сяброў, а яе павадыры ня маюць даверра з боку работнікаў, але пакінем гэтую Раду ў супакоі, бо з кожным днём і без таго яе

пустыя рады пусьцеюць, засьпяваем ёй лепш „за ўпакой“ ды пяройдзем да пачатае тэмы; дык вось, апрача гэтага, абнаўленьня т. ё. выбараў новых сяброў Рады, на парадку дзенным стаяў пункт „бягучыя справы“, пры разглядзе гэтага пункту кожны дэлегат меў права ўносіць усе пытаньні, якія зьяўляюцца балючымі ў сучасны момант для работніцкай клясы, а дзеля таго, што ў сучасны момант для працоўных беларусаў была балючая справа „завешаньне“ Т-ва Белар. Школы ў Вільні, дык прадстаўнік аднаго з прафсаюзаў унёс рэзалюцыю, у якой гаварылася, што Горадзенскія работнікі, якія аб'яднаны пад сьцягам Рады Клясавых Прафсаюзаў катэгарычна... (аб Т-ве баімся пісаць, бо ня раз на гэтыя пратэсты цэнзура накладвала штраф на газэту) і наагул проці самастойнага жыцьця беларускага народу, далей у рэзалюцыі апісваліся тыя дэфэнзыўныя элемэнты, якія прылажылі свае рукі да гэтае справы, між іншымі, не абмінулі Антаніну і Янку Станкевіча, якія таксама прылучыліся да гэтага завешаньня, як ініцыятараў. Але вось гэтая рэзалюцыя ня была дачытана да канца, бо калі дайшло да таго мейсца, дзе гаварылася, „што работнікі добра ведаюць, што ксяндзы Сель-партыі Станкевіч, палянафілы Паўлюкевіч і Умястоўскі, ёсьць слугамі санацыі, а ворагамі працоўных беларусаў і г. д., тады вось, пэпэсаўскі пасол на Сойм Добіца, які на гэтую канфэрэнцыю быў выбраны, як старшыня, перарваў чытаньне яе і сказаў, што я не пазволю, каб маіх калегаў(?)—так абражалі і не дапушчу, каб гэтая рэзалюцыя была прынята, і матывуючы, што гэтая рэзалюцыя носіць палітычны характар і забараніў яе дачытаць, хаця фактычна, здаецца, ня была ў ёй нічагусенькі палітычнага.

Дык нам, беларусам, няма нічога дзіўнага, што пэпэсы лічаць Паўлючкоў, Умястоўскіх, Станкевічаў і інш. спэкулянтаў, якія спэкулююць беларускім народам, сваімі калегамі, бо мо', пэўна, ня раз спатыкаецеся дзе разам у пэўных ужэндах, а вось, што датыцыць культурна-нацыянальнага нашага жыцьця залічваць да палітыкі, дык мы, Горадзенцы, ня ведалі, што вы майстры, цяпер ўжо добра ведаем вас і прадстаўляем, як вы можаце бараніць, пане пасол, нашу беларускую культурную справу у Сойме. **Арк.**

— **Як прайшоў дзень сацыялістычнай моладзі.** 7-га кастрычніка с. г. у ППС (правіцы) прынята сьвяткаваць, як дзень моладзі, дык вось у гэты дзень у салі мястовага тэатру пэпэсаўская арганізацыя T. U. R. (таварыства ўнівэрсытэту работніцкага) ладзіла абход гэтага дня, быў прачытаны рэфэрат, пастаўлена аднаактоўка, а пасьля гэтага ўсяго на заканчэньне, пэпэсаўцы кідалі свае „рэвалюцыйныя“ лёзунгі ды пачалі пяяць „Чырвоны Штандар“, але, відаць, прысутным слухачом работнікам ня вельмі спадабаліся ані пэпэсаўскія рэфэраты, ані лёзунгі і гімны, калі колькі іх там было прысутных зацягнулі камуністычны „Інтэрнацыянал“, пасьля якога зачалі кідаць свае лёзунгі, як прэч з „Turam“, няхай жыве міжнародная салідарнасьць работніцкае моладзі і г. д. Як відаць, дык работнікі добра пазналі ваўкоў П. П. С., хоць яны і апрануты ў авечую шкуру...

Як падае „Dzieńnik Kresowy“ з 9. X. 28 г., у Горадні 7-га кастрычніка ў дзень сацыялістычнай моладзі на Магістрацкай вуліцы камуністы выкінулі вялікі чырвоны сьцяг, на якім былі напісаны антыдзяржаўныя лёзунгі.

Наша хроніка.

Вялізарны працэс. 15-га кастрычніка пачаўся ў Акружным Судзе ў Вільні вялізарны працэс—быццам сяброў КПЗБ. Абвінавачваюцца 35 чалавек беларускіх сялян з 102 арт. I ч. К.К. (у прыгатаваньні збройнага паўстаньня і г. д.). 23 асобы адказвае з вастрогу, рэшта 12 з вольнасьці.

Сьведкаў фігуруе разам 93, з якіх 35 з боку пракуратуры і 58 з боку абароны.

Склад судзьдзяў наступны: судзьдзя Едзевіч — старшыня, і судзьдзі Бжозоўскі і Умястоўскі. Абвінавачвае вядомы з працэсу „Грамады“ падпракуратар Раўвэ.

Бароняць адв.: Дурач, Шышкоўскі, Чэрніхаў, Мюллер, Аляхновіч і інш.

Падсудных даставілі ў суд пад узмоцненай эскортай. Акт абвінавачаньня займае 22 аркушы машынкавага друку і абвінавачвае, што падсудныя, жыхары Маладэчанскага, Ашмянскага і Валожынскага паветаў, належалі да загавору (śpisku), мэўшага на мэце адарваньне ад Польшчы ўсходніх земляў, выкліканьне паўстаньня, скасаваньне існуючага ладу і далучэньне гэтых земляў да СССР.

Па адчытаньні акту абвінавачаньня на салі Суда пакінута толькі 11 падсудных, якія быццам прызналіся да віны. Аднак, на запытаньне суда частка з іх адмаўляецца ад свайго прызнаньня да віны, пазываючыся на тое, што яно было вымушана „баданьнем“. Уводзяць рэшту абвінавачаных. Суд зьвяртаецца па чарзе да кожнага з іх: „ці прызнаецца да прыналежнасьці да ячэйкі“. Усе пярэчаць гэтаму, зазначаючы, што належалі да „Грамады“.

Наступнае — прысяга сьведкаў. З боку абвінавачваньня знаходзіцца цэлы шэраг сьведкаў, вядомых з галоснага працэсу „Грамады“. Гэта большай часткай паліцыянты, як нейкі Гэпэль, на якога грамадаўцы „wydali wyrok śmierci“ і агенты дэфэнзывы.

Пасьля прысягі пачалася пытаньне сьведкаў. Суд пратрывае некалькі дзён. Аб далейшым яго ходзе падамо ў наступным нумары.

Выпушчаны на волю. Гэтымі днямі выйшаў з Вялейскай турмы Шаўлюк Пётра, які „адбываў кару“ за „праступкі“ за часоў існаваньня Грамады. Да суду прасядзеў ён 11 месяцаў і пасьля суду—19 месяцаў.

У часе галадоўкі яго моцна „частавалі“ вядомымі ласункамі.

Дзьве лекцыі. У салі Віленскай Беларускай Гімназіі 14 г. м. адбыліся дзьве лекцыі: грам. А. Луцкевіча і Янкі Станкевіча. Прысутных было поўная саля, — пераважна вучні Гімназіі і студэнты.

Пасьля першай лекцыі (грам. А. Луцкевіча), якая прайшла з вялізнай зацікаўленасьцю, выступіў Янка Станкевіч, але, відаць, адно імя „спадара“ прышлося „не да спадобы“ шмат каму з слухачоў. Ня ўсьпеў ён даказаць, што беларуская мова бліжэй да польскай, чым да расейскай, як яго „дзівосы і сьмяхоты“ пакрыліся кашлям і шумам. Калі „абструктантаў“ выгналі вон, саля пачала пусьцець і выходзячыя (пераважна вучні), як пратэст, што іх трактуюць брудам з беларускага сьметніка, запялі „Ад веку мы спалі“... Калі „неблаганадзёжны“ элемэнт пакінуў салю, асталося ў апошняй пара студэнтаў — радні Станкевіча, якім і ўдалося праслухаць бязглузьдзіцу „будучага прафэсара“ беларусазнаўства пры Варшаўскім Унівэрсытэце.

Але-ж гэтым „эпыбяды“ „паважанага“ лектара ня скончыліся. На другі дзень, якраз у часе перапынку лекцыяў, зьявіўся Станкевіч у Гімназію, як яго ізноў вучні спаткалі кашлем. Каб вылячыць сваіх пацыентаў ад гэтае прыкрае яму хваробы, „доктар ад кашлю“ схапіў кій і пачаў ганяцца за вучнямі. Аднаго сяк-так злавіў і схапіўшы за што трэба, і трасучы кіем каля носу „ходаўся“ дабедаца прозьвішча „хворага“.

Што было далей, чытачы хіба ўбачаць з усяго гэтага самі. Мы ад'значым толькі тое, што ад гэтае дзяцінай „забавы“ шмат вучаніц захварэла і ўсе баяцца хадзіць у гімназію і з гімназіі, каб не спаткацца са сваім „доктарам ад кашлю“.

Падаючы гэты факт, падобны да байкі, трэба ад'значыць, што апекавацца падобнымі „лектарамі“ трэба ня кіраўнікам В.Б.Г., а адпаведным ўстановам — (шпіталям), бо калі падобныя выбрыкі шалёных людзей будуць у гімназіі мець месца яшчэ раз, дык бацькі будуць змушаны пазабіраць сваіх дзяцей з гімназіі.

Гэта значыць санацыя?!

Радашкаўская Белар. Школа імені Фр. Скарыны. У Радашкоўскай Беларускай Школе ім. Фр. Скарыны з праграмай 5-ці клясаў гімназіі заняткі пачаліся. Новыя вучні прыймаюцца ўва ўсе клясы.

Есьць надзея, што праграма будзе пашырана да 6-х клясаў гімназіі.

Курсы пчалярства. З мэтай павялічэньня даходнасьці пчальнікоў і азнаямленьня мяйсцовага жыхарства з рацыянальным пчалярствам, саюз „Кулэк Рольнічых“ і Пчалярскае Т-ва Віленскай Зямлі, арганізуе ў Паставах, у памяшчэньні Народнага Дому 3-х дзенны курс пчалярства. Пачатак курсу 27-га кастрычніка с. г. а 3 гадз. папаўдні. Уваход для ўсіх бясплатны.

Зьмяшчаючы гэта, радзім пчалярам скарыстаць з гэтага курсу, каб паглыбіць фаховую веду, адначасна зазначаючы, што ў Вільні існуе Беларускае Каапэратыўнае Пчалярскае Т-ва „Пчала“, у якое кожны сьвядомы беларус-пчаляр мусіць запісацца. Адрас „Пчалы“: Вільня, Віленская вул. № 8, пам. Беларускага Каапэратыўнага Банку.

Адношаньні ППС-аў да работнікаў. 8 га кастрычніка г. г. у Бэрнадынскім садзе здарыўся наступны выпадак. Да работніцы Ядвігі Семашка, якая працуе, разам з іншымі работнікамі і работніцамі па ўпрыгожаньні гораду ў магістрацкай сэкцыі „ogrodnictwa miastowego“ пачаў падлабунівацца і выкідаць ня зусім прыстойныя жарты дзесятнік работаў Рагуцкі. На ўвагу работніцы, каб не перашкаджаў працаваць, гэты панок зусім быў разышоўся і толькі рыдлёўка ў працоўных руках стрымала далейшыя жарты п. Рагуцкага. На гэтым, здаецца, павінна было-б і закончыцца — атрымаў і насі на здароўе, „катузе па заслузе“. На другі дзень па гэтым выпадку, калі грам. Я. Семашка зьявілася да працы, была вельмі зьдзіўлена, калі з вуснаў кіраўніка работаў пана Балюкаса дачулася, што яна звольнена ад працы — зрэдукована, як кажуць палякі. Для беднае дзяўчыны гэта было, як абухам па галаве. Яна пачала прасіць п. Балюкаса, каб ён указаў матывы, на падставе якіх яна пазбаўлена працы, а разам з ею і кавалка чорнага хлеба (бо плата магістрацкая вельмі мізэрная). Замест матываў і замест людзкае адпаведзі, п. Балюкас ударыў кабету ў грудзі. Удар быў, на столькі моцны, што Я. Семашка павалілася і страціла прытомнасьць. Работнікі, бачучы ня жывой сваю таварышку па працы, паклікалі паліцыянта № 1515, які адразу затэлефанаваў па скорую помач, бо работніца ўсё яшчэ ляжала ня прытомная.

Але п. Балюкас і тут перашкодзіў, бо нанова пазваніў і сказаў, што помачы ўжо ня трэба. Не дачакаўшыся хуткае помачы, паліцыянт разам з адным работнікам, ухапіўшы хворую на дарожку, павязьлі да доктара Вінга, які даў хворай першую дапамогу і сцьвердзіў, аб чым выдаў засьвядчэньне, моцны удар у грудзі. Работнік ад доктара, адвезшы хворую да хаты, вярнуўся да працы, але ўжо ня быў да яе дапушчаны тым-жа самым п. Балюкасам. Пры чым на галаву работніка пасыпаўся цэлы град лаянак, якія спыніліся толькі тады, калі ўсе работнікі і работніцы ў знак пратэсту кінулі працу і дамоў, пайшлі абвесьціўшы забастоўку за нялюдзкія адносіны і бясправье кіраўнікоў.

Чым уся гэтая справа кончыцца — ня ведама. Варта тут ад'значыць, Балюкас падлягае ў сваёй працы пану Чыжу, вядомаму ў Вільні ППС. Дзіўна, што „пан сацыяліст“ пазваляе свайму „падуладнаму“ такія зьдзекі над працоўнаю беднатою, але, як відаць, яблыка ад яблыні не далёка коціцца, бо адносіны і самога пана Чыжа да работнікаў чыста пэпэсаўскія. Няхай успомніць работніцу, якая яго адчытвала і работнікаў, з якіх трэбаваў, каб навет у часе працы зьнімалі перад ім „яснавяльможным“ панам ППС шапку. Але цяпер можа справа гэтая не заглохне і ёй будзе даны ход.

Канфіската. Надовячы сканфіскаваны польскімі ўладамі № 118 літоўскай часопісі „Vilniaus Aidas“. Канфіската была быццам за цэлы шэраг ілжывых, ня згодных з праўдай, ведамасьцяў, — так як часта робіцца і з нашай газэтай.

Рэдактар цягнецца пад суд.

Бруд і вашывасьць у школах. Апошні нядаўні мэдыцынскі пэрагляд пачатковых школаў у Вільні сьцьвярдзіў у 37 хрысьціянскіх (польскіх) школах 2.705 брудных дзяцей, а 2.449 завашыўленых. У 18 жыдоўскіх школах сьцьверджана 1.212 брудных дзяцей, а 335 завашыўленых.

З жыцьця Лідчыны. № 237 „Słowa“ падае наступную вестку з жыцьця Лідчыны. „Згодна з атрыманымі з Ліды ведамасьцямі, з прычыны прыпадаючага сьвята камуністычнай моладзі, вывротовыя (чаму не камуністычныя?—Рэд.) элемэнты, маніліся, як у горадзе, так і ў павеце з'арганізаваць вялікія маніфэстацыі. Ува ўсіх мясцовасьцях, найбольш у самай Лідзе, Эйшышках і Варанове раскідана вялізарны лік камуністычнай літэратуры. Адначасна камуністычныя агітатары падбурвалі людпасьць да выступленьняў, але ўся іх праца „spełzła na niczem“.

З крывавых парахункаў за лес. У прэсе ўсё часьцей зьяўляюцца весткі аб крывавых, а то і сьмяротных парахунках у лесе, паміж лясными „зладзеямі“ і лясьнікамі. Як прыклад гэтага шырокага зьявішча на абшарах Зах. Беларусі, падаем наступны:

„Надовячы лясьнік ўрадовых лясоў Вялейскага пав., Павал Качук, абходзячы лес, сканстатаваў прысутнасьць у ім лясных „дэфраўдантаў“. Пашоўшы на гук сякераў, Качук заўважыў некалькі чалавек, ссякаючы дзерава. На крык Качука, „дэфраўданты“ пачалі ў яго страляць, пры чым цяжка ранілі яго ў грудзі, пасьля чаго ўцяклі. Сьледзтва ня дала ніякага рэзультату“.

Ці ня кажуць гэтыя, усё пашыраючыяся факты, аб драўняным голадзе на багатых лесам „Крэсах“?

Забойства. 11.IX прыбліэна а гадзіне восьмай с. г. жыхары вёскі Бурдукоў Івенскай гміны Зьмітрок Лапата, Уладзімір Ціхон—у адной лодцы, а ў другой—Аляксандар Ціхон і Кастусь Ціхон паехалі лавіць рыбу на раку Гаўю. Лавілі яны рыбу восьцямі з агнём уночы. Убачыўшы гэта, паліцыянт Дакудаўскага пастарунку Станіслаў Бартошэвіч і Казёл зайшлі ў в. Мікулічыні, зьнялі вартаўніка Васіля Пашаху і разам пашлі да рэчкі. Там сталі ў альховых кустах, чакаючы, пакуль рыбакі да іх не надплылі на якіх дзесяць шагоў. Тады паліцыянт Бартошэвіч сказаў вартаўніку Васілю Пашаку адыйсьці на дзесяць шагоў, а сам нічога ня кажучы, выстраліў, кладучы трупам Зьмітра Лапату. І толькі, калі Лапата зваліўся ня жывы ў воду, ён крыкнуў стой!

Забойца не арыштаваны і не завешаны, а толькі за „кару“ пераведзены з Дакудаўскага пастарунку ў Ліду. Больш да гэтага нічога не дадаем...

Пасольскае веча ў Беластоку. № 296 „Rzeczypospolitej“ інфармуе, што ў Беластоку адбылося веча нейкага „лявіцовага“ пасла, які востра заатакаваў урад, асабліва за яго палітыку да работнікаў і рабіў урад адказным за Лодзкую забастоўку. Прысутныя на вечы ПСС-ы перашкаджалі прамоўцы рознымі выкрыкамі. Пры справаздачы пасла аб загранічнай палітыцы дайшло да вялікай „авантуры“ з пэпэсаўцамі, з прычыны чаго веча было зьліквідавана паліцыяй.

Ня трэба, хіба, казаць, як добра пэпэсам жывецца пад апекай паліцыі.

Чыгуначная катастрофа ў Ашмяне. Надовячы ў Ашмяне здарылася чыгуначная катастрофа. 4 вагоны разьбіта. Цяжка пабіты кандуктар Антон Жаброўскі.

Перасьцярога для эмігрантаў.

Частковая стабілізацыя капіталізму ў Польшчы і ў іншых краёх дасягнута коштам нязьмернай эксплёатацыі працоўных масаў, коштам нялюдзкай працы сялян і работнікаў. Працоўныя гушчы апынуліся ў страшэнным палажэньні. Малазямельле на вёсцы, беспрацоўе ў горадзе—вось, падарунак капіталістаў і абшарнікаў для сялян і работнікаў. Апошнія, шукаючы ратунку, думаюць знайсьці яго ў эміграцыі, у выяздзе ў другія капіталістычныя дзяржавы, як у Аргэнтыну, Бразылію, Канаду, Францыю і г. д. Капіталісты падтрымліваюць гэтыя настроі сярод масаў, бо гэта ім на-руку. Яны пазбаўляюцца найбольш небясьпечнага для сябе элемэнту,—прыціснутых, галадуючых працоўных, — якія ў будучыне стануць першымі змагарамі за сацыялізм.

Выехаўшых у іншыя капіталістычныя дзяржавы шукаць для сябе ратунку, чакае тое самае—цяжкая праца і голад. Капіталізм скрозь дае знаць аб сабе.

Як доказ гэтага, рэдакцыя нядаўна атрымала ліст беларуса-эмігранта з Аргентыны, які піша аб тым, што чакае работнікаў у Аргэнтыне.

„Беднасьць і нядоля нашага працоўнага люду—піша ён — змушае пакідаць сваю родную сям'ю і шукаць сабе прытулку за межамі свае Бацькаўшчыны. Большасьць сялян і работнікаў нішчаць сваю апошнюю маемасьць, пакідаюць сваіх бацькоў, братоў, жонак і дзяцей бяз хлеба, а самі едуць шукаць сабе лепшага быту за акіян у далёкую, чужую старонку Аргэнтыну. Браты Беларусы! Перасьцерагаю вас, каб больш ніхто навет і ня думаў ехаць у гэтую абманчывую Амэрыку, бо тут нашы работнікі з сотні адзін мае сабе працу, з якое можа пражыць, а рэшта ходзяць, як жабракі, з мяшкамі, галодныя, абарваныя, ня ведаючы тутэйшае гутаркі, праклінаючы сваю марную долю.

Таварышы, ня слухайце правакацыі буржуазіі. Тут нас эксплёатуюць ня горш, як у Польшчы. Нашых работнікаў стараюцца завезьці ў самыя дзікія і бязлюдныя мяйсцовасьці, адкуль і пехатою ня прыдзеш і на цягнік не заробіш.

Яшчэ раз паўтараю, што хто хоча бачыць амэрыканскае жыцьцё, той няхай купіць гішпанскі самавучыцель і навучыцца патутэйшаму прасіць хлеба.

Рабочы тут нясе на сваіх плячох ня менш цяжкае ярмо, як рабочыя ў капіталістычных дзяржавах Эўропы“. **М. Ш.**

З Т-ва Бел. Школы.

З Працы Гуртоў Т-ва Бел. Шк.

— 21./IX. с. г. Залацееўскі гурток Т-ва Белар. Школы Дзярэчанскай гм., Слонімскага пав., ладзіў вечарыну. Гулялі „Выбары старшыні“ Я. Быліны і „Страхі жыцьця“ Ф. Аляхновіча. Абедзьве п'есы прайшлі ўдачна. Артысты гулялі надзіва. Народу было шмат. На гэтай вечарыне быў прысутны Янка Грэцкі, які нядаўна прыехаў з Амэрыкі, пражыўшы там 15 гадоў. Калі ён, 15 лет таму назад, выяжджаў з Бацькаўшчыны ў далёкую чужыну, беларускі працоўны народ яшчэ спаў моцным сном. Яшчэ ня было нічога падобнага да цяперашняга. Вось гэтая перамена і робіць на яго вялікае ўражаньне. Па сканчэньні вечарыны Я. Грэцкі шчыра дзякаваў артыстам і ўсім супрацоўнікам на ніве ўсьведамленьня працоўных мас і на культурна-асьветныя мэты ахвяраваў 5 даляраў. Залацееўскі гурток Т-ва Белар. Школы за ахвярнасьць Янкі Грэцкага, за тое, што ён, ня гледзячы на шматгадовае жыцьцё на чужыне, не забыўся аб сваіх братох, — складае ад імя Гуртка шчырую падзяку!

— Гурток Т-ва Белар. Школы ў вёсцы Лакно, Азерскае гм., Горадзенскага пав., можна сказаць, „прымёр“, упаў у „сьпячку“. Што-ж за прычына? Па-першае, упадак энэргіі, дзякуючы варожым адносінам улады, па-другое, неахвотнасьць сяброў. Але досьць гэтага! Трэба ўзяцца за працу, якая дасьць усьведамленьне і асьвету нашым сялянам.

Не зважаць на перашкоды, якія сумысьля робяцца, каб падарваць наш дух. Дык дружна.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Змаганьне за родную школу.

(Вёска В.-Кракотка, Слонімскага павету).

Ужо чатыры гады мы складаем дэклярацыі на родную школу, аднак, дарма, бо знаходзіліся прайдзісьветы, якія роднае школы да нас не дапускалі. Злажылі дэкляраціі і ў 1927 г. на 68 дзяцей і з вялікаю радасьцю чакалі роднае школы. Вось дачакаліся: прыяжджае вучыцель з суседняе вёскі Сялявічы з нашай „nauczycielkaj“ (паходзіць з нашае вёскі) і фэльчарам (мужык вучыцелькі) і выбіраюць pożądnych ludzi“. Зазвалі ў школу і давай „мытарыць“, ну, вядома, якая тут гутарка была. Адзін з дэклярантаў адказаў проста: „не абманвайце мяне, бо я хачу роднае школы і падпісвацца ня буду“ (бо давалі штосьці падпісваць, але што—мы ня ведаем), знаходзіліся такія, якім было сорамна не падпісацца перад вучыцелькай, ці фэльчарам. А адна жанчына адказваючыся, што ня граматная, не хацела падпісваць, дык фэльчар Ульян Філютовіч кажа: я расьпішуся і расьпісаўся. Аднак, не знашлося на гэты раз несьвядомых, абманутых бацькоў на 40 дзяцей. Прыяжджаў той самы вучыцель яшчэ два разы, але дарма. У самы рабочы час — жніва выклікае школьны інспэктар 15 дэклярантаў у Слонім за 27 вёрст. Страшыў паліцыяй, калі ня будзеце падпісваць, аднак, і на гэты раз дарма. Выклікалі ізноў усіх дэклярантаў у гміну за 10 вёрст, але мы, уважаючы гэтыя „badania“ за непатрэбную валакіту — не пашлі, а злажылі пратэст проці зьдзеку над нашым правам і адаслалі куратару. Аднак, некаторыя бацькі, баючыся штрафу, пашлі і ўжо нарэшце і інспэктару ўдалося абмануць, ня ведамым нам спосабам, нашых дэклярантаў, бо сказаў: „więcej niech nie idą“. І вось, замест школы,

атрымалі рэзалюцыю п. Куратара, што беларускае школы ня будзе, бо ўсяго 37 дзяцей. Дзе-ж рэшта — 31 дзіця?

Вось „апякуны“ прадалі за „срэбранікі“ асьвету нашых дзяцей, нашу родную школу. Але хай памятаюць, што яны атрымоўваюць ня грошы, а сьлёзы нашых дзяцей, якія будуць праклінаць ўсё жыцьцё іх, за тое, што яны назаўсёды асталіся цёмнымі. Бо ёсьць дзеці, якія скончылі „cztery oddziały“, а напрасі прачытаць, ці расьпісацца, дык і ня ўмее. Вось, да чаго давялі якія дзьве асобы. Але ганьба ім за гэта назаўсёды. А мы, бацькі, ня гледзячы на ўсе перашкоды, настараймася злажыць чым найбольш дэкларацыяў, і гэтым дакажам ім, што мы ведаем, чаго дабіваемся так упорчыва. Усе, як адзін, на барацьбу за родную школу! Хай кожны бацька, ці маці, ведае свой абавязак у гэтым годзе — злажыць дэкларацыю на родную школу, а перамога павінна быць нашай.

Стары.

Барацьба за родную школу.

(Вёска Залацеева, Дзярэчынскай гміны, Слонімскага павету).

Сяляне нашай вёскі ўжо тры гады вядуць упорлівую барацьбу за родную школу.

Яшчэ ў 1925 г. мы падалі праз паўнамоцніка школьнаму інспэктару ў Слоніме 46 дэкларацыяў на 56 дзяцей — школы нам ня далі.

У 1926 г. злажылі 37 дэкларацыяў на 47 дзяцей — школы ізноў няма.

У 1927 г. з усімі фармальнасьцямі, з усімі пунктуальнасьцямі злажылі гэтаму-ж Інспэктару 42 дэкл. на 56 дзяцей. Цяпер ужо сяляне былі пэўныя, што дзеці іх будуць вучыцца ў сваёй беларускай школе і чакалі новага школьнага году. І што вы скажаце!? — 25.IX-1928 г. паўнамоцнік атрымаў праз гміну ад Куратарыума ліст, у якім заяўляецца, што беларускай школы ў в. Залацееве ня можа быць, бо дэкларацыяў зложана ўсяго на 30 дзяцей.

Дзе-ж дзеліся дэкларацыі на 26 дзяцей, чаму іх уняважнілі? Аб гэтым Куратарыум нічога ня кажа.

Вось і рабі, што хочаш, а Канстытуцыя і Рыжскі трактат ясна забясьпечваюць нам школу ў роднай мове!

У адказ на ўсе гэтыя надужыцьці, на ламаньне нашых правоў, на калечаньне нашых дзетак у чужых, польскіх школах, — мы ўсе павінны злажыць дэкларацыі яшчэ ў большым ліку з цьвёрдым дамаганьнем роднай школы!

Дык, бацькі! Усе, як адзін, на школьны фронт! **Мужык.**

Нас разбудзілі!..

(Вол. Германовічы, Дзісенскага пав.).

Мінулі месяцы, перайшлі й гады ад часу, калі ў нашым кутку ўсе кляліся з высілкаў у барацьбе за волю працоўнага народу. Усе—маладыя і старыя—ішлі да гэтай сьвятой мэты, крышачы па дарозе перашкоды. Не спадабалася нашым „апякуном“ сьвядомасьць наша. І шмат, шмат хто з нашых найактыўнейшых братоў апынуўся... Астаўшыяся сілы пачалі драмаць, і сьніць сны аб лепшым заўтра. А панкі, карыстаючыся нашым часовым сном, кінулася да нас, і пачалі ствараць розныя „Strzelcy“, „Kółka“, за якія ксёндз Бобіч абяцаў рай, спасеньне душам і г. д.

Але дарма! Дрэмлючая сіла ізноў уваскросла! Яна ізноў нястрыманай віхурай панеслася наперад!

Пачалі расьці гурткі Т. Б. Ш. і крынічыцца ўсе „кулкі“,—сьвядомасьць, жаданьне веды, прасьветы забілі жыватворнай крыніцай.

30. IX.—28 г. у м-ку Германовічах адбылася вечарына-спэктакль, праграма якога была наступная: „Боты“, „Зьбянтэжаны Саўка“, дэклямацыі вершаў „Покліч“ Я. Коласа, „Ворагам беларушчыны“ Я. Купалы, „Ня чурайся!“ М. Бурачка і „Як тут не сьмяяцца“... Я. Купалы. Вечарына прайшла надзвычайна ажыўлёна. З якой сілай і пачуцьцём вырываліся словы з вуснаў маладых артыстаў, колькі падала воплескаў з боку прысутных, як падзяка артыстам,—трудна апісаць.

На канец пачаліся скокі з „Лявоніхай“ на чале, а „апякунам“ усё гэта на злосьць! Вось яны зажадалі, хоць пад канец, пашкодзіць нам. З гэтай мэтай напаілі трох цёмных, дурных хлапцоў і загадалі ім разагнаць „białoruskę zabawę, кажучы, што „za to wam nic nie będzie“. Аднак, з гэтага нічога ня вышла, бо што зробяць тры асобы супроць 150! І вось так вечарына кончылася спакойна. Чысты даход пайшоў на бібліятэку-чытальню.

Дык чэсьць Вам, Браты! Чэсьць, ніштыцелі цемры! За Вашую працу працоўныя масы кажуць Вам шчырае „дзякуй“!

Я. Няшчасны.

Хто нашы перашкоднікі?

(Лідзкі павет, Новадворская гміна).

Першым перашкоднікам і юдаю зьяўляецца наш дзяк Аляксандар Якімовіч, які паходзіць з сялянскае сям'і з вёскі Наташоў. Ён, зрабіўшыся дзяком, адразу забыўся аб тым, як прыходзілася яму тры дні працаваць на пана Мікульскага за тое, што пасьвілася на панскай пашы яго карова, бо ў самога зямлі, як легчы сабацы, дый то хвост будзе на чужым ляжаць. Мае яшчэ ён 2-х братоў, якія таксама пайшлі яго дарогаю: захварэлі на паноў. Яны ўсе разам перашкаджаюць нашай працы ў сваей культурна-асьветнай арганізацыі і, апроч таго, чапляюцца да людзей, пазбаўляючы іх кавалка хлеба.

Так пры нашай царкві ёсьць сторож, які сядзеў на гэтым мейсцы 18 гадоў—Аўген Сямашка. Дык, як толькі наш дзяк зьявіўся на наш прыход (ён у нас ужо 2-гі год), стаў ганяць гэтага стоража з яго пасады, чым пазбаўляў беднага чалавека і яго 6-х дзяцей адзінага кавалка хлеба.

Усе прыхаджане шкадавалі гэтага бядняка, плакаўшага горкімі сьлязамі і зварочваліся з просьбай у кансісторыю, каб сторож застаўся на мейсцы. Але грамадзкая просьба засталася бяз скутку, бо дзяка падтрымаў поп.

Дык вось наш поп з дзяком—гэта нашы непрыяцелі... **Жаласьлівы.**

Шамякін суд.

(М. Моўчадзь, Баранавіцкага павету).

14.X у Моўчадзі Гарадызкім судзьдзёй разглядалася справа сялян в. Міцькавічы ў справе падзелу. Яшчэ пры жыцьці бацькі старшы брат аддзяліўся, узяў $8^{1}/_{2}$ дз. купленае зямлі, супольнымі высілкамі зроблена была яму хата, хлеў і іншы патрэбны будынак. Здавалася, усё было добра, але па сьмерці бацькі, карыстаючыся з таго, што малодшы брат з сястрою цёмныя людзі, старэйшы брат задумаў адабраць ад іх яшчэ траціну зямлі, якая ў ліку $7^{1}/_{2}$ дз. дасталася ім па сьмерці бацькі і траціну будынку. І вось прад судом сталі дзьве стараны: з адной хітры і пранырлівы царскі чыноўнік і цяперашні солтыс, а з другой цёмныя сяляне.

Пад час расправы малодшы брат папрасіў, каб паклікалі сьведкаў. Справа была адложана дзеля правядзеньня сьледства на месцы.

16.IX у Міцькавічы прыбыў судзьдзя і, паклікаўшы братоў, папытаўся аб граніцах зямлі, і, не папрасіўшы сьведкаў, а навет нікога з людзей, паехаў.

17.IX быў прачытаны прыгавар, па якому старэйшы брат дастаў траціну зямлі і будынку г. з. да $8^{1}/_{2}$ дз. яшчэ $2^{1}/_{2}$, а на гэтых двох засталося 5 дзесяцін.

Чым карыстаўся пры гэтым судзьдзя? Адным словам, суд „скоры, правы, міласьцівы“.

Дзед Мацей.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— **Моўчадзь, Баранавіцкага пав.** У нядзелю, 31-га жніўня, поп моўчадзкай царквы, акрэсьліўшы значэньне паветранай флёты надчас вайны і прызваўшы сялян да ахвярнасьці, пачаў зьбіраць грошы на аэрапляны і газы. Стаўшы з крыжам, кантраляваў „айцец“ Мікалай, хто сколькі паложыць на талерку.

Добра, айцец Мікалай! А што-ж кажа вашая запаведзь? Ці-ж ня выразна яна кажа: „не забі“!

Дык ня дзівіся-ж, баця, што пасьля такіх выпадкаў у царкве робіцца што-раз „пусьцей“. **Дзед Мацей.**

— **Маладэчанскі пав.** Янка Станкевіч (або інакш „навучоны спадар“) у апошнія часы пачаў энэргічна „ўсьведамляць“ сялян сваім ворганам „Народ“. У Маладэчанскі павет ён цэлымі пукамі шле сваю „бібулу“ так, што сяляне аж дзівяцца, як ён ведае іх адрасы. Аднак, газэты не адкідаюць, бо хутка піліпаўка і будзе ў што ўкручваць селядцы. А бедны „Янка“ думае, што калі мы будзем чытаць яго ворган, дык усе запішамся ў яго „Зьвяз“. Дарма, што наш селянін ціхі, спакойны,—ён, таксама хітры, як чарток. **Верасок.**

— **У Баранавіцкім Гуртку Т-ва Бел. Шк.** ня ўсё робіцца так, як гэта пішацца ў карэспандэнцыях. Напр., як пісалася аб „Футбольнай кампаніі“, якая мае вельмі хутка арганізавацца. Аднак, далёка яшчэ да гэтага, бо моладзь нашая зусім яшчэ да гэтага не падгатавана.

Дык вось, трэба менш пісаць аб тым, што нехта падумаў залажыць „Бел. футбольную кампанію“, а больш зьвярнуць увагу на дзейнасьць Т-ва, больш папрацаваць на карысьць адраджэнскага культурна-асьветнага руху і тады толькі, як будзе што-колечы зроблена, сказаць: і мы здольны працаваць! А цяпер крытыкуйце ўсе недахопы, усе ўхілы. Гэта будзе карысьней, бо гэная праца, якая цяпер вядзецца ў Баранавіцкім Гуртку Т. Б. Ш. ня рухаецца нат і з мейсца, пакуль толькі мары паасобных сяброў будуць малявацца ружовымі хварбамі, а ня будуць праводзіцца ў жыцьце. **Эд.**

— **???** (Дзісеншчына). 2 чэрвеня г. г. на начлезе Аляксей Гарадзёнак—паліцэйскі служка, (як ён сам сябе называе) быў страшна п'яны і валяючыся абадраў сабе лоб аб калючы дрот. Аднак, будучы са мной у непаразуменьні, бо ў гэтую-ж ноч бяз ніякае прычыны біў мяне, ён на заўтра прывёў паліцыю і сказаў, што я яго набіў. Паліцыянт мяне арыштаваў і завёў на пастарунак. Калі мы падышлі да лесу, дык тут выехаў на веласыпэдзе камэндант Тамілаўскага пастарунку Судзярскі, нічога ня кажучы лаяў мяне, абзываючы камуністам, а потым... (Рэдакцыя тут па цэнзурным умовам робіць пропуск). А калі змучыўся над гэтай „працай“—паехаў ізноў у лес.

Прывялі мяне на пастарунак і, пратрымаўшы да вечара—выпусьцілі. **З. Д.**

— **Змаганьне за родную школу.** (Дзісеншчына, в. Дзедзіна). Падавалі мы ў 26 г. дэкларацыі на ўрадовую беларускую школу. Атрымалі польскую, бо прыехаў нейкі прайдзісьвет і запрасіў усіх бацькоў расьпісацца, хто хоча беларускае школы. Дзякуючы несьвядомасьці—расьпісаліся.

Як пасьля даведаліся, дык там быў абман. Расьпісваліся не на беларускую, а на польскую школу.

Нічога ня зробіш. У 27 г. мы ізноў дружна, як адзін, падалі дэкларацыі на беларускую школу. Ажна цяпер лепшы спосаб прыдумалі. Мы падалі дэкларацыі на 46 дзяцей, а інспэктар прызнаў важнымі толькі 38.

Мы падалі жалабу Міністру асьветы, але... адказу не атрымалі і дасюль.

Дык, грамадзяне, усе, як адзін, на змаганьне за родную школу!

У барацьбе мы здабудзем права свае.

Змагар за родную школу.

— **Дзярэчынская гм., Слонімскага павету.** Перавыбары гміннай рады ў нас закончыліся яшчэ ў леташнім годзе. Зразу, пасьля гэтага, новая рада прыступіла да выбару таксванага „zarządu gminnego“, якога яшчэ і дагэтуль ня можа закончыць. Шмат было выбрана войтаў (на якіх, вядома, выбіралі сьвядомых і чэсных людзей), аднак, пан Староста ніводнага з іх не зацьвярдзіў. І вось, калі рада не магла ніяк закончыць выбараў, Староста зрабіў „ласку“ і назначыў свайго войта, В. Александровіча (паляка, былага камэнданта паліцыі), а тая-ж гмінная рада на 4-тым сваім паседжаньні зацьвердзіла назначэньне Старосты — і выбрала яго таксама. Такім чынам, рада пайшла на ўгоду, абы толькі закончыць выбары. На 5-тым паседжаньні рада прыступіла да выбару заступніка войта. Быў выбраны Дожын Даніла, папулярны сярод люднасьці. Але ўжо прайшло каля трох месяцаў, а Староста ніяк ня можа яго зацьвердзіць.

Дык вось, які „самаўрад“ у „дэмакратычнай“ Рэспубліцы!

— Гэта самая рада ў бюджэце на 1928-29 г. уставіла пункт, у якім назначыла 1100 зл. на беларускае школьніцтва (для Т-ва Бел. Школы). Староста-ж, як звычайна, скасаваў 1000 зл., а рэшту, 100 зл., перакруціў на Наваградзкую Б. Г.

Але рада, не жадаючы каб яе пастановы мянялі, на паседжаньні 9/IX с. г. скасавала гэты пункт зусім. **НО.**

— **В. Малое-Запрудзьдзе, Забрэскай гм., Valожынскага пав.** Сёлета абшарнік скасіў сялянскую сенажаць, не аддаўшы ім навет часткі сена. Ня гледзячы на падобныя зьдзекі над нашай цемрай, нашая моладзь, замест змагацца з гэтым, — сьпіць. Хлапцы б'юцца, п'юць гарэлку, граюць у карты і г. д. Браты! Кіньце гэта, а вазьмецеся за карысную працу. Першым крокам вашай працы павінна быць найхутчэйшае заснаваньне гуртка Т-ва Бел. Шк. Дык да працы!

Ш.

— (В. Мелякавічы, Баранавіцкага пав.). Два тыдні таму назад Апанасік Д., спаткаўшы па дарозе хлапца з свае вёскі Сымона Сокала, які сьвядома пад час выбараў ня сьхіліўся ў бок хлусьні з-пад шыльду 40 (Спадар), а сьмела і адкрыта пайшоў за сялянска-работн. фронтам, за фронтам змаганьня за свае правы, пашыраючы **№ 39.** І вось Апанасік Д. захацеў на гэтым сьвядомым хлопцу памсьціцца.

Сьпярша абкідаў лаянкай, а пасьля, робячы правакацыйныя закіды, што нібы Сымон Сокал атрымліваў заплату за сваю працу і быў куплены і ад гэтага дайшоў аж да кулакоў, у выніку чаго хлапец С. С. быў моцна пабіты, а ў далейшым брудную справу А. Д. захацелася дакончыць бруднейшым захадам. Маючы ў сябе раней пабітае вакно, або мо' і знарок разьбіўшы яго па прыходзе дамоў—А. Д. прывёў паліцыю і пачаў паказваць, што разьбіў яго С. С., кінуўшы на яго праз вакно каменем. Аднак, паліцыя гэтаму не паверыла.

Дык вось, браты сяляне, да чаго даходзяць гэтыя чорнасоценцы з-пад. фірмы Спадара, Міткевіча Умястоўскага і інш.

Дуброва.

— **Мірская гм., Браслаўскага пав.** Есьць у нас знаны навакол пан Харчэнько. Есьць пан, ёсьць і падлізы, якіх ён падкупіў, каб ляпей ціснуць бедных сялян. Такімі зьяўляюцца грамадзяне, як С. Марозько, С. Юхна, А. Шакель і др. Вось, пры помачы іх, гэты панок і вядзе сваю „справядлівую“ працу. Аднойчы пастухі вёскі Канахі пасьвілі быдла на сваім пасьвішчы, блізка ад панскага балота, у якое, дзеля яго мокрасьці, доступ амаль што не магчымы. Цяпер вось гэтыя падлізы „ізволілі“ паказаць публічна сваю ўслужлівасьць да пана, кажучы (натуральна, няпраўду), што быдла паслося ў панскім балоце. Справу яны перадалі ў суд, які прысудзіў сялянам плаціць 500 зл. Другім разам хлапцы з вёскі Картавая пайшлі ў своё балота, шукаць качак. Падчас пашуківаньняў іх сустрэлі тыя-ж падлізы і зьдзёрлі шапкі, грозячы, што, калі другі раз зловяць, дык бакі „натруць“ і ў суд пададуць. Дык вось, браткі, як нам жывецца! **Сяліцкі.**

З Радавае Беларусі.

З хронікі беларускай навукі.

— **Адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук.** Рада Народных Камісараў Радавай Беларусі 4-га кастрычніка г. г. пастанавіла ператварыць Інстытут Беларускай Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук. Часова вызначана камісія для кіраваньня — Хацкевіч, Ігнатоўскі, Баліцкі, Некрашэвіч і Аршанскі.

— Камісія аховы помнікаў старажытнасьцяў Беларусі пры І.Б.К. пастанавіла перадаць Барысаўскі запаведнік пад загад Галаўнавукі. Таксама пастаноўлена арганізаваць Палескі запаведнік.

— На падставе досьледаў мінулых гадоў І.Б.К. злажыў 10 вёрсную геобатанічную карту Беларусі. Карта дае наглядны малюнак пашырэньня расьлін на Беларусі.

— Аддзел прыроды і гаспадаркі інбелкульту складаецца цяпер з 12 розных катэдраў. У бліжэйшым часе маюць быць адчынены: сэкцыя прыкладной гэалёгіі, катэдра фізыкі, кат. фізыолёгіі, кат. хімічнай тэхнолёгіі, а ў далейшыя часы І.Б.К. мяркуецца адчыніць іншыя катэдры, адпаведна вымаганьням акадэмічнай структуры І.Б.К. і гаспадарчых патрэб дзяржавы.

На наступны год будуць асыгнаваны сродкі на арганізацыю цэнтральнага батанічнага і заолёгічнага садоў у Менску.

— Праф. Мельнік напісаў цэлы рад прац аб беларускіх лясох, гэтым галоўным багацьці Беларусі. У працах праф. Мельніка ёсьць апісаньне паркавых парод расьліннасьці, фэнолёгічныя назіраньні над расьліннасьцю і інш., усяго па гэтай справе выдана навуковых прац.

Прафэсар Бераход выпусьціў да 30 розных прац, прысьвечаных, галоўным чынам, вывучэньню эканомікі лясоў Б.С.С.Р.

Паштовая скрынка.

Дуброве. Ваш артыкул „Урадавыя лекі“ немагчыма надрукаваць з прычын цэнзурных. Вельмі частыя канфіскаты ў апошнія часы нашай газэты якраз добра сьведчаць аб тым, якая „свабода слова“ пануе ў нашых абставінах. Вось-жа, пішучы артыкулы, бярыце гэта пад увагу. З прысланых карэспандэнцыяў скарыстаем, аднак, просім Вас пісаць карацей і выразьней, каб ня трэба было марнаваць часу і паперы на перапісваньне, тым—больш, што Вы пабеларуску пішаце правільна. Апошні прысланы верш „Да моладзі“ пойдзе ў „Куток моладзі“.—**Яну Круку.** Вы просіце ў сваім пісьме, каб вашыя „творы“ „прачытаць раз і другі раз, каб ляпей разабраць“. Мы прачыталі адзін раз і „разабралі“, што Вы „свае творы“ проста-на-праста сьпісалі з „Маланкі“. Радзім Вам не займацца гэтым глупствам, бо толькі марнуеце паперу ды траціце грошы на маркі. Пішэце лепш карэспандэнцыі з сялянскага жыцьця.—**С. А.** Вы пішаце: „я не паэта“, дык на што-ж прысылаеце свае „вершы“? Пішэце лепш карэспандэнцыя з жыцьця сялян і сялянскай моладзі. — **Шчодраму.** У вашым пісьме шмат асабістасьцяў, а тое, аб чым пішаце, ня мае шырэйшага грамадзкага значэньня. Пішэце лепш, як жывуць сяляне вашай ваколіцы, як змагаюцца за свае правы.—**В. Шарамэту.** Пісьмо вашае адразу ў адным нумары нашае газэты ня можам зьмясьціць, бо нехапіла-б мейсца для іншых карэспандэнцыяў. Будзем зьмяшчаць пакрысе ў кожным нумары.—**Нявольніку, Дзеду Мацею, Падслухачу, Вясёламу, Свайму, Беларусу з пад Ліды, Вольнадумцу, Дубіцкаму, Беднаму, Горкаму і Звону.** Вашыя карэспандэнцыі атрымалі. Будзем пакрысе зьмяшчаць. Дзякуем. Пішэце больш.

Усячына.

Дзіўная кніжачка.

„Kurjer Wileński“ № 235 піша:

Да Польскай Akademji „Umiejętności“ прыслана брашурка, выдрукаваная на дрэннай (?) паперы, пад загалоўкам „Адам Хмель. Беларуская гмінная песьня. Адбітка з тому VII часткі І Матэр'ялаў і Працаў Камісіі Языковай Акадэміі „Umiejętności ў Кракаве“.

Пад гэтым адбіта пячаць Акадэміі ў хворме ўжыванай да 1918 г. і ўнізе: „Кракаў. Коштам Акадэміі „Umiejętności“. Галоўны склад у кнігарні польскай выдавецкай суполкі“.

„Але другі загаловак брашуркі, складаючайся з 60-ці старонак, такі: „Песьні, сабраныя з Віленшчыны“, далей на наступнай старонцы ідзе новы беларускі загаловак, надрукаваны кірыліцай, які тут паўтараем: „Л. Родзевіч. № На паняволеных гонях“; на адвароце дыдакцыя: „Барацьбітам за вызваленьне Зах. Беларусі з-пад панскай акупацыі прысьвячаю. Аўтар“.

Што да вершаў у гэтым зборнічку, „Kur. Wil.“ піша:

„Вершы тут скіраваны проці рэлігіі, праваслаўнага і каталіцкага духавенства, а перадусім проці Рэчыпаспалітай Польскай, земскіх уласьнікаў (інакш абшарнікаў), прадстаўнікаў прамыслу (інакш капіталістаў). Заходняя Беларусь — пад Польшчай — гэта пекла, паводле гэных вершаў, — усходняя ў складзе Саветаў — гэта рай для селяніна. Вершапліт вучыць, што няма бога (праз малое б), ані неба і бяз іх абайдзецца, бо і так будзе досыць хлеба. Каталіцкі ксёндз і праваслаўны поп—аднолькавыя злодзеі, як паны і шляхта, бо абдзіраюць народ і селяніна (!). Толькі Ленін ёсьць збавіцелем і бацькам для селяніна і работніка, і таксама... атаман Муха (?). Заклікае народ... (тут мы гэтым і абмяжуемся, бо далейшы навет перадрук з „Kur. Wil.“ для нашае газэты небясьпечна з боку цэнзуры. Што можна адным—дык гэта не даказвае, што можна і другім. Рэд.).

Рэдактар-Выдавец: П. Пяткун.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.